**Святаслаў Альшэнка-Вільха/ Святослав Ольшенко-Вільха** (1910 – 1944) – Літаратурны псеўданім паэта і празаіка, лёс якога пасля 1944 году невядомы. Нарадзіўся ў 1910 годзе, скончыў украінскую гімназію ў Цярнопалі, пачаў друкаваць свае вершы ў Львове. З 1936 годзе працаваў у часопісах “Дарога”, “Малыя сябры” і інш. Першы зборнік паэзіі “Чужая вясна” выдадзены ў Кракаве ў 1941 годзе, зборнік апавяданняў “Чырвоная карчма” – там жа ў 1942 годзе. Большасць яго вершаў і апавяданняў прысвечаныя тэме барацьбы роднага народа за свабоду і звернутыя супраць галоўнага ворага – Масквы.

## Руды кот
(Рудий кіт)

– Тых колькінаццаць гадоў, што ляглі паміж намі, пакуль мы не бачыліся, прынеслі мне шмат-шмат новага… можа, аж занадта… Даводзілася чымала і цягацца па свеце, знаёміцца з новымі людзьмі, прыглядацца да іхнага жыцця, зжывацца з імі. Прага, Вена, Грац, Берлін… Сюды і туды, і ўсё дзеля таго толькі, каб зноў вярнуцца сюды!

Сідар замоўк. Ягоная высокая, прысадзістая постаць, прытуленая да разварочанага маланкай ствала сасны, здавалася яшчэ вышэйшай і мацнейшай. Толькі бледны твар і сціснутыя вусны казалі пра нейкае балючае перажыванне.

– Аднаго, бач, не разумею ў табе! – пачаў Мірон. – З тваіх словаў выходзіць, што ты шкадуеш, што вярнуўся з белага свету зноў сюды… Чаму?.. Я таксама Нямеччыну і Італію аб’ехаў і анітрохі мне не шкада, што я зноў тут апыніўся. Кажуць, што акторы – цыгане. Не, гэта лухта! Я па сабе ведаю. Цягнула чалавека ў белы свет, ды яшчэ мацней цягнула назад дадому… Прыгадаў я, што хацеў цябе спытаць пра тое, як ты ўладкаваў сваё жыццё. Я быў чуў, што ты ажаніўся. Прабач, можа я дапытлівы, але дома ў цябе я жонкі не бачыў.

Сідар стаяў заслуханы ў лес. Твар ягоны заўважна ажывіўся. Знік на хвілінку гэты брыжык болю каля вуснаў. Вочы загарэліся на здзіўленне жыва. Доўга глядзеў на свайго сябра, які павярнуўся ў ягоны бок. Праз імгненне ягонае ажыўленне знікла. Стаў як раней: халодны, без агню ў шэрых вачах, як разварочаная маланкай сасна.

– Не ў тым справа, – пачаў паволі. – Можа, і цягнула вяртацца ў край, цягнула так, як сабаку на паляванне. Ты гэта ведаеш. Ты ездзіў… Разумееш… Гэтую шалёную, вар’яцкую настальгію ведаюць толькі тыя, што далёка ад роднага краю… Ды яно ў мяне цяпер такое ўсё пераблытанае, паразрыванае. Хопіць табе, дружа, расказаць… хопіць… можа, неяк іншым разам.

У лесе стаяла глыбокая цішыня, толькі недзе ў верхавецці дрэваў заблытаўся вецер і дзіка выводзіў свае пранізлівыя мелодыі… Гудзенне высачэзных соснаў налятала прыдушана ў цішыню лесу і скаланала яе, нібы голасныя крокі ў самотным храме.

Сосны гулі і было чамусьці смутна.

Хутка, чапляючы верхавіны дрэў, імчала бура.



prajdzisvet.org

– Хадзем у хату, – паспешна крыкнуў Мірон. – Бура ідзе!

Сідар здзіўлена глянуў на яго і моўчкі пацягнуўся за ім. Прыслухаўся да шуму соснаў, распазнаваў іх кожны шэпт, нібы не хацеў разлучацца з імі…

Сядзелі на верандзе. За шыбамі шалела бура. Дождж біў вялікімі кроплямі ў вокны, ураган навальваўся на дрэвы, гнуў іх да зямлі, ламаў і гнаў па лесе. Маланкі танюткімі стружкамі расколвалі хмары і з дзікім грукатам скочваліся ў даліну.

Сідар сядзеў моўчкі і скрозь шыбы пільна ўглядаўся ў лес. Мірона непакоіла энэргія стыхіі, што з такой сілай разгулялася, нервы ў яго былі настолькі расстроеныя, што кожны грукат грому выклікаў у яго трымценне. Яшчэ мацней ён адчуваў гэта цяпер, калі яны маўчалі. Сідар адвёў вочы ад акна, заварушыўся на крэсле і глянуў на сябра. Адчуў, што ён насцярожаны. Паволі, няспешна пачаў гаварыць.

– Цябе непакоіць бура, бо ты не разумееш яе, ты не зжыўся з ёй! Я за гэтыя шэсць гадоў, што жыву тут адзін сярод лясоў, прывык да яе, разумею кожны парыў ветру, кожны грукат грому… Я люблю яе… Здаецца, што разам з бурай, калі яна надрываецца ў прасторы, надрываецца і душа. Ты ж не можаш яе зразумець, бо жывеш у горадзе. Вось калі б цяпер не гэтая бура, то я б ніколі не расказаў табе маёй гісторыі з рудым катом. Толькі цяпер магу табе гэта расказваць.

– Гісторыя з рудым катом? – жыва спытаў Мірон. – У цябе ёсць кот? Я не бачыў яго ў цябе.

− Не, ён толькі прыходзіць да мяне. Склалася так, што маё жыццё, − пачаў паволі Сідар, − было досыць хімернае і разнастайнае. Ведаеш, добра, што з маленства я прабіваўся сам скрозь усе перашкоды. Пасля смерці бацькі, маці заставалася без граша, без кавалка хлеба, без даху над галавой. Я тады хадзіў да пятай гімназійнай. Увесь год я замучваў сябе ўрокамі, каб толькі ўтрымацца ў гімназіі. Прыйшлі вакацыі… Вакацыі – гэта самы лепшы, але самы кароткі час для кожнага вучня. Як і кожны год, тым разам я паехаў да мамы ў вёску. Мама мая жыла пры бацькавых сваяках. Два месяцы адпачынку з мамай, якая была для мяне ўсім, – гэта было насамрэч самае лепшае ў маім жыцці. І на гэтых самых вакацыях я ўпершыню сустрэўся з гэтым катом.

Мірон з нецярплівасцю заварушыўся на крэсле. Спакойны голас Сідара раздражняў яго.

− Як звычайна, у вёсцы, дзе ёсць рэчка, купаюцца хлопцы. У Зярноўцы таксама была рэчка. Штодзень я хадзіў туды з вясковымі аднагодкамі купацца. Гэта было – акурат прыгадваю – сёмага ліпеня на Івана Купалу. Усе мы ўжо купаліся… Я адплыў далей ад хлопцаў… І тады ўпершыню ўбачыў яго… Ён стаяў на беразе і…



prajdzisvet.org

Ярка-зялёнае святло заліло лес, пякельны грукат заглушыў словы Сідара. Маланка ўдарыла ў высачэзны дуб. Дрэва з грукатам звалілася на зямлю. Недзе далёка паміж дрэвамі яшчэ лунаў прыглушаны адгалосак.

Мірон увесь здрыгануўся. Сідар спакойна, нібы нічога не здарылася, працягваў гаварыць:

− Стаяў на бераз і глядзеў мне проста ў вочы… Акурат выразна бачыў я ягоныя зялёныя вочы, што яскрава адбіваліся ад рудой поўсці. Такога ката я яшчэ ніколі не бачыў. Зацікавіла мяне, адкуль ён тут узяўся, далёка ад вёскі і хат, сярод чыстага поля. Я пачаў плыць у ягоным кірунку. Ні на хвіліну не спускаў з яго вачэй, абы пабачыць, куды ён будзе ўцякаць. Але ён спакойненька стаяў і глядзеў мне ў вочы… Я пачаў плыць хутчэй. І тады здарылася самае дзіўнае… Руды кот засмяяўся… Кот… Разумееш… Нібы злобны чалавек…

Мірон усміхнуўся.

− Я працягваў плыць, каб дастаць яго. Аж раптам ў галаву маю зайшла запамарока, усё знікла, згарэла і наступіла цемра… Я ачомаўся толькі праз гадзіну. Мяне абступілі хлопцы – бледныя, перапужаныя, а ляжаў на зямлі. Яны сказалі мне, што я ужо быў на тым свеце, і што яны ўжо больш за гадзіну мяне ратуюць. “Дзе ён? Дзе гэты кот?” − спытаў я ўсхвалявана. Здзіўленыя твары хлопцаў пераканалі мяне, што яны нічога не ведаюць пра ката. А калі яны пачалі мяне супакойваць, я зразумеў, што яны думаюць, нібыта ў мяне гарачка. Ні слова больш не спытаў  я ў іх пра ката.

Мірон іранічна ўхмыльнуўся. Уся гэтая гісторыя мала здавалася яму сапраўднай прыгодай. Ён не раз сустракаў такія выпадкі, што тапелец у апошні момант мог бачыць нейкага мужчыну ці жанчыну з утрапным позіркам, але ж усё гэта была толькі перадсмяротная імажынацыя, пад уплывам жаху перад смерцю. Але ён на хацей гаварыць пра гэта Сідару, бо меў падазрэнне, што так і не пераканае яго.

− Заўжды, калі са мной павінна было здарыцца нейкае няшчасце, з’яўляўся гэты кот. Прыносіў гэтае няшчасце з сабой і толькі потым спакойна сыходзіў з глумам у зялёных вачах. Не буду расказваць табе, як ён ужо сем разоў прыходзіў да мяне і заўжды прыносіў нейкае ліха. Апавяду табе пра апошняе ягонае “гасцяванне”.

За вокнамі сціхала бура. Дождж яшчэ ліў, далёка за лясамі перакочвалася навала і глуха білі грымоты. Мірон спакойна глядзеў на Сідара. Скрыўленыя, заўважна сціснутыя вусны, надавалі яму рашучы выгляд...

− Ты пытаў, ці ажаніўся я? Так. Акурат пасля вяртання з-за мяжы я атрымаў месца ў лясах пад Вільняй… Завёў шырокае кола знаёмых сярод землякоў у горадзе, Там, у доме аднаго ўрача, я пазнаёміўся з будучай жонкай. Два гады мы сустракаліся, хадзілі разам. Скажу табе праўду, раней жаніцца я ніколі ахвоты не меў. Бачыў скрозь аблуду і не хацеў даць сябе абдурыць. Але Марушка была зусім іншай… зусім не тая, што іншыя жанчыны, і я пакахаў яе. Не ведаю, ці змог бы хто мацней пакахаць. Яна



prajdzisvet.org

таксама мяне кахала… Паміж намі не было ніякіх таямніц, толькі праўда… Мы пабраліся… Два гады я правяраў яе і сябе, ці зможам жыць разам, не так, як усе тыя іншыя “добрыя” сужэнствы, але па праўдзе. Міналі гады і яны здаваліся нам днямі… На чацверты год нашага жыцця прынялі ўласнікі лясоў на практыку маладога лесніка. Мы з ім пасябравалі. І тады сталася тое, у што я не верыў ніколі… Прыйшла неўспадзеў мана. Ці разумееш ты, што тады тварылася са мной?! Уся мая вера да Марушкі знікла… Разбілася, як флакон ці каштоўная статуэтка... Не, не… Гэта яшчэ горш… Аскепкі разбітай веры заселі ў мяне ў душы, як стрэмкі. Не ведаю, што магло прывабіць яе ў тым, іншым. Фізічная прыгажосць? Не. Бо ў яго яе не было… Душа? Таксама не. Марушку бадай не магла прыцягнуь душа пасрэднага чалавека, які жыў марай пра кар’еру, пра хлеб надзённы… Я бачыў усё… І калі я сказаў ёй, што яна мае перад мной таямніцу, яна заплакала… Ды яе плач быў для меня толькі наяўным доказам, што яна ашукала мяне. Я больш не кахаў яе. Я нават ведаў, куды яны ходзяць, і не хацеў ім замінаць.

…У той вечар я сядзеў у пакоі адзін. Яна, як звычайна, пайшла да яго. За той вечар я прадумаў усё. Разам жыць нам хопіць. І я пастанавіў рашуча сказаць ёй гэта. Цягнуліся доўгія гадзіны. Была позняя ноч. Я спакойна хадзіў па пакоі.  Раптам мае вочы спыніліся на вялікім люстры ў іншым канцы пакоя. Я падышоў да яго… У залачонай раме яно надавала пакою больш прыгажосці і цяпла. Гэта было Марушчына люстра. Нейкую хвіліну я глядзеўся ў яго… Трэба сказаць, што я працаваў тады надта заўзята, і некалькі бяссонных начэй змучылі мяне ўшчэнт. Я амаль не пазнаў сябе… І тады… Ці чуеш ты? Тады я ўбачыў за спінай яго… рудога ката… Ён пасля многіх гадоў знайшоў мяне зноў… Стаяў спакойненька за мной і смяяўся… Смяяўся, аж белыя зубы ашчэрыў. Я выхапіў браўнінг і стрэліў у яго… Бо ён жа смяяўся, як тады, калі я тануў… смяяўся, як і кожны раз, калі прыходзіў да мяне…

Ад звону разбітага шкла я схамянуўся і зразумеў, што страляў у люстра… Раструшчанае, з тонкімі кавалкамі шкла, што віселі каля рамы, яно выглядала агідна. І я не мог стрымаць сябе… Каб не бачыць гэтых разбітых кавалкаў, я працягваў страляць па іх, пакуль не выстраляў усю абойму… Толькі тады мне стала лягчэй… Была глыбокая ноч, калі прыйшла Марушка. Усхваляваная, яна забегла ў мой пакой. Я не падняўся з крэсла… Лампа гарэла цьмяна і было ціха… Яна ўбачыла раструшчанае люстра і з жахам павярнулася да дзвярэй. Яна спужалася мяне. Я спыніў яе, яна баязліва прысела на крэсла… І тады я сказаў, што паміж намі ўсё скончана, што яна вольная. Яна плакала, але гэта была толькі камедыя. Той жа ночы я, не паведамляючы гаспадарам, выехаў прэч. Што з ёй сталася, я не ведаю.

Сідар замоўк. Дождж сцішыўся. Неба развіднела. Сонца садзілася за лесам і залаціла ствалы дрэў… Было ціха і спакойна.

− І з таго часу, што стаў для мяне смерцю душы, гэты кот больш мяне не наведваў… А можа, я тады забіў яго?.. – важкі голас Сідара сведчыў, як цяжка яму было апавядаць сваю таямніцу. – Пракляты руды кот! Ён знішчыў

мяне зусім, загнаў, як самотніка ў гэтую палескую пушчу, дзе чалавек жыве толькі з лесам, бо людзей хіба раз на месяц можна ўбачыць…

− Сідару, я хачу табе прапанаваць нешта новае, – сказаў Мірон. – У мяне вольнага часу яшчэ два поўных месяцы да пачатку тэатральнага сезону. Я забяру цябе адсюль у горад. Пабудзем між людзей. Там багата нашых таварышаў, павесялішся хоць некалькі тыдняў. Бо хопіць табе дзічэць сярод гэтых лясоў і балот… Папрасі адпачынак і паедзем… Добра?

− Можа… Не ведаю!

Ужо тыдзень жыў Сідар у Мірона ў горадзе. Вялікае таварыства трохі ажывіла яго, бледны твар ужо не выглядаў такім пахмурым. Штовечар сябры заходзілі ў рэстаран, дзе збіралася ўся акторска-мастацкая братыя. Нават ў стасунках з жанчынамі быў заўважны ўплыў таварыства. Некаторыя з іх гурта раз’ехаліся з часам па курортах, да знаёмых, сваякоў і па вёсках. Мірон таксама хацеў праведаць сваю радню, што жыла ў Перадгор’і. Сідар ніяк не згаджаўся паехаць разам з ім, хацеў пабыць некалькі тыдняў у горадзе, а потым паехаць да сябе, на Палессе. Толькі пасля доўгіх угавораў даў сябе пераканаць і нарэшце паехаў…

У Сальніцу штолета прыязджала шмат курортнікаў і жыццё анітрохі нудным не было. Да мясцовага настаўніка штогод прыязджала яго сваячка Галя, дачка дырэктара банку. Зазвычай прыязджала яна сюды на бацькавым аўтамабілі. Мірон ведаў яе яшчэ з даўніх часоў.

Яе вясёлая натура хутка прывабіла Сідара. Найчасцей ён бавіў час у яе таварыстве, бо заўжды смяшлівы прыгожы тварык і задорысты голас Галі суцяшаў яго нервы. Калі ўсё таварыства выбіралася на прагулянку, то заўжды ехалі на Галіным аўтамабілі, якім кіраваў Сідар.

Быў цёплы жнівеньскі ранак… Таварыства, што выбралася на прагулянку, даехала да месца, дзе скончылася прыдатная для машын дарога. Тут усе вышлі з аўтамабіля і засталіся чакаць, пакуль Сідар праедзе трохі далей і разведае, ці ёсць дарога для машыны… Пасля таго, як ён знік за паваротам, мінула гадзіна… Сідар павінен быў вяртацца. Усе пачалі страчваць цярпенне. Нарэшце недзе за паваротам азвалася аўтамабільная сірэна… Таварыства ажывілася… Вось паказваецца элегантны капот “крайслера”. Вяртаецца… Ад таварыства яго аддзяляе толькі крутая дарожка над лагчынай… Сідар пускае машыну хутчэй… І тады…

Усе бачаць, як перад аўтамабілем прабягае руды кот. Мірон ускрыквае… Машына дзіўна падскоквае, хітаецца, нібы п’яная, і з усяго разгону коціцца ў лагчыну.

Доўгае маўчанне. Толькі зварушаныя камяні лятуць услед за машынай… Галя громка ўскрыквае, закрывае далонямі твар і істэрычна плача. Самыя смелыя паволі спускаюцца ў лагчыну. На дне ляжыць раструшчаная машына… паламаныя колы, разбіты кузаў… А пад машынай да паловы выхіленае вялікае цела Сідара… З вуснаў танюткім цурком капае кроў… І на ілбе відаць чырвоныя плямы крыві…



prajdzisvet.org

Мірон нахіляецца бліжэй і пазнае… адбіткі запэцканых кроўю каціных лапак…

*пераклад з украінскай* – Таццяна Урублеўская

© Таццяна Урублеўская, пераклад, 2009